# ХЛОПЧЫК І ЛЁТЧЫК

Словы Я. Купалы

Музыка Я. Цікоцкага






1. Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я — ведай, вялікі ўжо хлопчык
І ўмею ўжо лётаць у сне. *2 разы*
2. Мне мама сягоння казала,
Што стукнула мне ўжо сем год,
Табе гэта, можа, і мала,
А мне ляцець толькі ў палёт. *2 разы*
3. Мне ўжо надакучыла дома —
У дзіцячы хадзі адно сад,
А так паглядзеў бы, вядома,
На іншы парадак і лад. *2 разы*
4. На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі,
Ляцеці далёка, высока
Ды так пабываць у Крамлі. *2 разы*
5. Вось гэтак у добрым здароўі
Мы будзем ляцець і ляцець.
Вазьмі ж мяне, лётчык, з сабою,
Не будзеш ты клопату мець! *2 разы*